***Ларыса Рыжкова***

**ПАДРЫХТОЎКА ДА СПЕЎНАЙ ІМПРАВІЗАЦЫІ Ў ДЗІЦЯЧЫМ ФАЛЬКЛОРНЫМ АНСАМБЛІ**

*У выканальніцкім майстэрстве кожнага спевака калектыву вельмі важнае значэнне мае ўменне да імправізацыі, а таксама здольнасць трымацца ўласнай лініі, прыслухоўваючыся да іншых членаў гурта. У дадзеным артыкуле прыводзяцца прыклады практыкаванняў, якія дапамогуць кіраўнікам дзіцячых калектываў арганізаваць працу па навучанні імправізацыі.*

***Larysa Ryzhkova***

**PREPARATION FOR SINGING IMPROVISATION IN THE CHILDREN'S FOLKLORE ENSEMBLE**

*The ability to improvise, as well as the ability to adhere to its own line, listening to the other members of the group is a very important skill for each person in the singer's team. This article provides examples of exercises that will help leaders of children's groups to organize work on improvisation training.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У фальклоры ўся спеўная музыка трымаецца на спеваку. На такім спеваку, якога Зінаіда Мажэйка называла «Карыфей». Ён выбірае тон, вядзе апавяданне, вызначае інтанацыю, рытм, тэмп, з якім пяецца песня. Ён фарміруе ансамбль, таму што згладжаецца ці не згладжаецца спяваць з кім-небудзь са спевакоў.

І гэтае лідарства не аўтарытарнае, самі удзельнікі спеўнай групы рады наяўнасці такога лідара, які бярэ на сябе адказнасць за ўдалыя спевы. У сітуацыі аўтэнтычнай вёскі песню запяе самы прызнаны спявак з прысутных. Пасля яго запеву будзе лёгка ўступіць усім жадаючым спяваць. Чалавек з талентам запявалы заўсёды ўцэліць у «залатое сячэнне» тону, які максімальна зручны, дасягальны для высокіх і нізкіх галасоў. І такія самародкі-запявалы ёсць сярод нас і сёння. У мяне ў ансамблі Калыханка у кожнай групе, у кожным узросце заўсёды былі 2-3 чалавекі, якія валодалі такім беспамылковым запевам.

Ад шматгадовага сумеснага музыцыравання ў правільным ансамблі спевакоў устанаўліваецца рэфлекторная ансамблевая сувязь, якая дае магчымасць імправізаваць. Мелодыя пры імправізацыі раскладваецца спевакамі, як шкельцы ў калейдаскопе. У залежнасці ад таго, што пяюць спявакі справа і злева, узнікае ўнікальная, мелодыя хвіліны – рэакцыя ў спевака ў цэнтры мінігрупы.

Гэта хвіліны «палёту», калі спевакі пяюць, кіруючыся толькі сваім пачуццём прыгожага. Пяюць так, як раней не спявалі. І гучыць новы паварот вядомай мелодыі, завіток, упрыгожанне, якога не было раней. Такое магчыма толькі тады, калі сабраліся спевакі спетыя, з якіх ніхто не разгубіцца, не саб'ецца ад узніклай побач імправізацыі. Яны ўсе ўзрадуюцца гэтаму палёту, як запрашэнню даследаваць новы куток райскага саду, - песні.

У гэта падарожжа трапяць і слухачы. Яны разам са спевакамі перажывуць захапленне ад гукавых асацыяцый, таму што такое яднанне выканаўцаў не можа не захапіць адным пачуццём і слухачоў. Моманты такого «палёта душ» за прыгажосцю заўсёды пертвараюцца толькі ў прыгажосць. Здольнасці так спяваць у ансамбля узнікаюць не адразу, а ў выніку шматгадовага слухання і спявання фальклору.

Імправізуючы, спевакі не трымаюцца пэўных «партый». Яны ведаюць ўсю палітру распеву мелодыі і выбіраюць сваю версію, якую ім дазваляюць голас, дыханне, пачуццё ў момант выканання песні. Атрымліваецца гукавы калейдаскоп. Компасам ў падарожжы па песні з'яўляецца пачуццё радасці і гармоніі ад ўзнікаючых гукавых вобразаў свайго голасу і галасоў партнёраў - асамблістаў. Негарманічны спеў адразу будзе пачуты спевакамі і слухачамі. Скончыцца шчасце аднадушша і еднасці. Райскі сад знікне.

У ансамбля "Калыханка" ёсць свае практыкаванні, якія дапамагаюць наблізіць, адчуць імправізацыю як вышэйшую асалоду спевака.

**АНТЫФОН.** Рыхтуюць да імправізацыі спевы антыфонаў. Гэта калі адзін хор наступае на другі хор. Адна група спевакоў яшчэ дапявае радок песні, а другая група ўступае з новым радком. І нейкія імгненні два ансамблі супадаюць у гучанні. Такое можна пачуць нават на сучасных купаллях. На адной паляне некалькі груп спевакоў пяюць адначасова розныя песні, а карціна гукавая атрымліваецца прыгожая, гарманічная. Такое сумеснае гукавое дзеянне рыхтуе імправізацыю, здольнасць весці «сваю лінію» у зоне актыўнага руху «другіх ліній».

**ВЯСЕЛЬНЫЯ ГАЛАШЭННІ**. У вясельных песнях бывае адначасовае выкананне вясельнай песні і галашэння маці нявесты, ці самой нявесты. Атрымліваецца вельмі складаная гукавая карціна. Хвалюючая, гарманічная. Гучыць прыгожая ансамблевая песня. Са сваім рытмам, мелодыяй. Раптам пачынаецца галашэнне, якое таксама мае свой меладычны малюнак і рытмічную арганізацыю. І гэтыя «паралельныя вымярэнні» ў выніку, гучаць гарманічна, нараджаючы новую гукавую рэальнасць: галашэнне на фоне вясельнай ансамблевай песні.

**ЛЕС**. У нас у Калыханцы ёсць практыкаванне «Лес». Дзеці ходзяць па пакоі ўзад-уперад, нібы гуляюць па лесе і гучна, «на ўвесь лес» пяюць кожны сваю песню. Шляхі іх сыходзяцца, разыходзяцца, дзеці чуюць адзін аднога і блытаюцца, збіваюцца. Але паступова прывыкаюць і пачынаюць трымацца ў рамках сваёй мелодыі, свайго «маналога». Сустрэўшыся, імкнуцца «пераспяваць» адзін аднаго, перамагчы, спяваючы гучна. Ці наадварот, паказаць, што можна спяваць «твар у твар» розныя песні і не «зваліцца» са сваёй пазіцыі.

**Музыка «ПАД ЯЗЫК».** Гэтае практыкаванне спрыяе адпрацоўцы добрай, выразнай артыкуляцыі, добра фарміруе слых і рыхтуе спевака да імправізацыі. Музыка «пад язык» - гэта імітацыя розных музычных інструментаў. Юныя артысты пантамімічна дэманструюць ігру на балалайцы, гармоніку, скрыпцы, барабанчыку, а спяваючы, імітуюць гук інструмента: Балалайка: «-тын-дыр, тын-дыр, тын-дыр, тын-дыр…». Гармонік: «ай-я-яй-я-яй-я-яй-я-ай-я-яй-я-ай-я-яй…». Скрыпка: «цілі-лі-лі-лі-лі-цілі-лі-лі-лі-лі-лі…». Барабанчык: «бам-бам-бам-бам. Бум-бум-бум-бум….»

Усе гэтыя склады складаюцца ў мелодыю якога-небудзь танца, напрыклад, лявоніхі, месяца, курапета, ці падэспані. Атрымліваецца вясёлая «мешанка» з гукаў, складоў, арганізаваная толькі рытмічным малюнкам, асноўным тонам і заданай мелодыяй.

**РАНІЦА Ў ВЁСЦЫ.** Ёсць у нас карагод «Сіта-рэшата». Ланцужок дзяцей ходзіць і пяе адну фразу: «Сіта- сіта, сіта-рэшато, заплятайся сіта очэнь харашо». І зноў: «Сіта-сіта, сіта-рэшато…». На гэтую мелодыю мы робім практыкаванне «Раніца ў вёсцы».

Я: «Дзеці, хто першы прачынаецца ў вёсцы?» Дзеці: «Пеўнік». Я: «А як ён пяе?». Дзеці: (пяюць на мелодыю «Сіта») «Ку-ку-ку-ку-ку-ку-ку-ку-ку, ку-ка-рэ-ку, ку-ку, ку-ка-рэ-ку-ку». Я: «А хто за пеўнікам прачынаецца?» Дзеці: «Курачка». Я: «А як яна пяе?». Дзеці: «Ко-ко-ко-ко-ко-ко-ко-ко-ко-ко-ко-ко-ко-ко-ко-ко-ко-ко-ко-ко-ко».

І так далей пра кароўку, бычка, сабачку, коціка, гусак, вутак, авечак, козачак, муху і, нават, жука. Я: «А цяпер пакажыце, як яны, прачнуўшыся, усе на двары гамоняць».

І тут дзеці пачынаюць разам крычаць – спяваць, паказваючы галасы розных звяроў. Атрымліваецца рознагалосы хор, які пяе мелодыю «сіта», але рознымі складамі-словамі. У курачкі слова кароткае: «ко-ко-ко», а ў кароўкі слова кароткае, але доўга цягнецца: «му-у-у-у». У жука адна літара:-ж-ж-ж-ж-ж. Атрымліваецца рознагалосы, рытмічна складаны, вясёлы хор. Дзеці вучацца адчуваць у хоры сваю «партыю», сваю «арыю», свой «маналог». І гарманічна ўключаць яго ў агульнае гукавае поле.

**«КЛІП» ДА ПЕСНІ.** А яшчэ мы любім маляваць голасам «карцінку», настрой. Ёсць у нас песня «Летала галубка пы саду, / за ёй галубчык у сляду. / -Што табе, галубчык, ды міне? / Ёсць ў цябе галубкі луччы міне. / -Колькі я па лесу не летаў, / -Луччы я галубкі не відаў».

Песня веснавая. У нас хлопчык пяе за галубка, а дзяўчынка пяе за галубку. А ўвесь ансамбль ціхенька імітуе трапяткі, ласкавы акампанемент:/ Тындыр-тындыр-тындыр… / -Ай-яй-яй-яй-яй-яй-ай-я-яй…/ Лю-лю-лю-лю-лю-лю-лю-лю.

Калі зададзеную мелодыю дзеці пяюць рознымі складамі, ціхенька, атрымліваецца такі ні то шоргат крылаў, ні то пляск вады, ні то шум лёгкага ветрыка. А некаторыя дзеці, захапіўшыся «аркестровым» працэсам, пачынаюць даваць нейкія эксклюзіўныя гукі: ўсхліпы, клёкат, варкутанне, што стварае сапраўдную карціну веснавога лесу з птушкамі, ручаямі, майскімі жукамі і іншымі радасцямі.

Такое практыкаванне пашырае музычныя, імправізацыйныя і, у цэлым, творчыя, мастацкія магчымасці дзяцей.

**ДРАЖНІЛКА СВАТУ.** Ёсць у нас усімі ўзростамі дзяцей любімая песня, запісаная ў вёсцы Ананчыцы Салігорскага раёна. Вясельная дражнілка Свату. Мы яе таксама зрабілі практыкаваннем і аздобілі акампанементам «пад язык».

Спявае ансамбль: А казалі сват вельмі харош, / у яго доўгі буслаў нос.

Нейкі фантазійны інструмент: -тындар-тындар, тындар, тындар… / А у свата лыса галава, / І казліна рыжа барада.

Другі інструмент: трунці-трунці, трунці-трунці… / Плавае па хаце, як таран, / Лыпае вачыма, як баран

Трэці інструмент: Бумба-румба-бумба-румба… / Калі сват цукерак не дасі, / Каравая сёння не з’ясі.

Заказ Свату ад спевакоў: Каравайчык- каравайчык- каравайчык- каравайчык. Потым ідуць заказы ад кожнага удзельніка ансамбля : -цукерачкі, цукерачкі… (накладваецца на ансамблевы «каравайчык») / абаранкі, абаранкі… (…на «каравайчык» і «цукеркі»)/ -і пячэнькі, і пячэнькі… (…на «каравайчык», «цукерачкі», «абаранкі» і г.д.) -піражочка, піражочка… / -мармеладзік, мармеладзік… / -торцік, торцік…

Атрымліваецца цікавая гукавая карціна. Гучыць шматслойны «заказ». Спевакам трэба вымавіць усё рытмічна і змясціць у музычную фразу вясельнай песні кожнае новае пажаданне. Гэта зусім не проста. Так будуецца «гранёная» артыкуляцыя, набліжаюцца здольнасці да ансамблевага адчування і імправізацыі.

***Алеся Силаева***

## МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ ПОДХОДЫ К ИССЛЕДОВАНИЮ ХОРОВОЙ ТЕАТРАЛИЗАЦИИ

*В статье рассматриваются некоторые работы исследователей хоровой театрализации. Искусствоведы отмечают ее связь с фольклорным искусством, с народной песней. Автор работы подчеркивает, что это именно тот пласт, который мог бы стать благодарной почвой для исследований предпосылок возникновения хорового театра и его исполнительских форм.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ